што там адбываецца, пакуль на вуліцах не з'яўляліся ўзброеныя людзі і не пачыналі страляць? Таму калі прыязджалі агітцягнікі, натоўпы да іх ламаліся. Дарэчы, найбольшай папулярнасцю ў «Гадавіне» карыстаўся ролік «Мозг савецкай Расіі», таму што ў ім можна было ўбачыць, хто прадстаўляе новую ўладу, як выглядаюць Ленін і Троцкі, а людзі маглі нават не ведаць, хто гэта такія.

— Значыць, магчыма, менавіта ў «Гадавіне» людзі ўпершыню ўбачылі Леніна.

— Вядома, больш нідзе яны яго ўбачыць не маглі. Дарэчы, у «Гадавіне» мы бачым першую здымку буйнога палітычнага дзеяча схаванай камерай. Ленін тады ўпершыню з'явіўся на вуліцы пасля ранення — на яго жыццё быў здзейснены замах, і папаўзлі чуткі, што ён памёр і бальшавікі гэта хаваюць, таму Леніна трэба было паказаць. Здымацца ён не любіў, тады кіраўнік спраў Саўнаркама Уладзімір Бонч-Бруевіч вывеў Леніна на шпацыр, а аператары з Кінакамітэта схаваліся за рознымі ўкрыццямі — за Цар-гарматай, кучамі смецця, аўтамабілем. Ленін у рэшце рэшт зразумеў, што яго здымаюць, але асабліва не раззлаваўся, і аператары падышлі бліжэй.

— Што датычыцца часткі «Мозг савецкай Расіі» — як здымаліся гэтыя партрэты? Забаўна, як палітыкі паводзяць сябе перад нязвыклай для іх кінакамерай. Ёсць гарэзны кадр, дзе на сцяне ззаду надрапана слова з трох літар.

— Толькі слова з трох літар у іншай частцы фільма. Калі ўважліва паглядзець ролік «Мозг савецкай Расіі», можна заўважыць, што многія людзі знятыя ў адным і тым жа месцы ў адзін і той жа дзень — тая ж Крамлёўская плошча, тая ж брукаванка, тыя ж аўтамабілі і будынкі. Мабыць, калі аператары знялі Леніна, іх выкарысталі, раз ужо прыехалі, каб захаваць і іншых дзеячаў савецкага ўрада, якіх проста вывелі на плошчу і знялі як на фотакамеру.

— Фільм складаецца з розных падзей: арганізацыя Часовага ўрада, пераварот у Петраградзе, у Маскве, Брэсцкі мір, узяцце Казані — на першы погляд, абсалютны разброд. Па якім прынцыпе ў юбілейным фільме Вертаў паказвае рэвалюцыю?

— Фільм не вельмі і юбілейны, бо палову часу тут распавядаецца пра тое, што адбываецца да Кастрычніцкага перавароту. Рэвалюцыя тады была яшчэ не датай, а няскончаным працэсам, «Гадавіна» і задумвалася як панарама доўгага працэсу, дзе Грамадзянская вайна — толькі працяг. Прынцып вельмі просты — у храналагічным парадку паказаць, што адбывалася кожныя два-тры месяцы. Хоць тут няма, напрыклад, узяцця Зімняга палаца, таму што яно адбывалася ноччу і папросту не было знята. На месцах падзей тады часта не аказвалася аператара: камера з усімі аксесуарамі важыла больш за шаснаццаць кілаграмаў — прынесці яе, паставіць, зарадзіць плёнку, і каб яшчэ цябе не збіў натоўп — было праблематычна. Сам Вертаў пісаў, што ў старым кіно суцэльныя пахаванні ды парады, але гэта лёгка растлумачыць — аператарам было лягчэй прыехаць на назначаныя падзеі, чым прадбачыць штурм Зімняга. Такім чынам нешта не было знята, а нейкія здымкі былі згубленыя ўжо да моманту, калі рабілася «Гадавіна», таму дакументальныя эпізоды таго часу маюць высокую каштоўнасць. У мяне таксама часта пытаюцца, чаму ў фільме так мала Леніна і так шмат Троцкага — ды таму што Ленін не любіў здымацца, а Троцкага ў паездках на фронт або на мітынгах заўсёды суправаджаў аператар.

— Мяне скарыла канцоўка «Гадавіны»: увесь фільм мы бачым маштабныя падзеі — перавароты, пахавальныя працэсіі, ваенныя дзеянні, а заканчваем сенажаццю.

— Спачатку я таксама схамянуўся і падумаў: «Трэба ж, які дзіўны фінал», — але потым вырашыў, што ён лагічны, бо фінал павінен быць пазітыўны і скіраваны ў будучыню, а першыя сельскагаспадарчыя камуны былі даволі папулярныя, людзі нават прыязджалі з-за мяжы, каб у такіх жыць. Мабыць, гэты спосаб новага мірнага жыцця, не падобнага да старога, быў настолькі паказальны, што яго ўставілі ў фінал.

— Як часта такога маштабу знаходкі здараюцца ў сучасным кіназнаўстве?

— Я займаюся кіназнаўствам ужо сорак гадоў, і на маёй памяці такое ўпершыню. Усе чакаюць, напрыклад, што знойдзецца згублены фільм Эйзенштэйна «Бежын луг», але ён усё роўна будзе толькі падзеяй біяграфіі аднаго рэжысёра. Тут жа — не толькі эпізод з жыцця Дзігі Вертава або гісторыі дакументальнага кіно, але і гісторыі наогул, усё ж Кастрычніцкая рэвалюцыя была падзеяй глабальнага маштабу. «Гадавіна» можа даць вельмі шмат матэрыялу для гістарычных даследаванняў, таму, безумоўна, будзе запатрабавана не толькі тымі, хто вывучае Вертава, але і тымі, хто вывучае савецкую і сусветную гісторыю. Таму на фестывальныя паказы гледачы прыязджалі з іншых гарадоў і нават краін. Дзе б я ні паказваў карціну, амаль усюды быў аншлаг. А падчас аднаго з паказаў у Маскве — гэта была публічная прэм'ера ў кінатэатры «Кастрычнік» з тысячай чалавек у зале — пачаліся палітычныя сутычкі. Хтосьці аказаўся манархістам, хтосьці бальшавіком, яны сталі сварыцца і крычаць адзін на аднаго: «Вы забілі Сталыпіна!» — «І правільна зрабілі!» Я не прысутнічаў у зале, але мне сталі дасылаць паведамленні, маўляў, зараз пачнецца панажоўшчына. Уяўляеце, тысяча чалавек пайшлі б урукапашную адзін на аднаго — а гаворка, здавалася б, ідзе пра падзеі стагадовай даўніны, і нашчадкі белых і чырвоных ужо даўно перажаніліся.

Гутарыла Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.

Юбілей

«Белыя росы» назаўсёды: Аляксею Дудараву — 70

Адзін з найлепшых беларускіх драматургаў і сцэнарыстаў Аляксей Дудараў, што адзначыўся выдатнымі работамі як у тэатры, так і кіно, сёння, 6 чэрвеня, адзначае свой 70-гадовы юбілей. У тэатры яго добра ведаюць, напрыклад, па п'есе «Радавыя», у кіно — па сцэнарыі культавага фільма «Белыя росы» з Мікалаем Карачанцавым у галоўнай ролі.

Будучы аўтар паспеў папрацаваць манцёрам сувязі і слесарам да таго, як скончыць тэатральна-мастацкі інстытут па спецыяльнасці «акцёр драмы і кіно». Пасля ён быў акцёрам у Тэатры юнага гледача, загадваў там літаратурнай часткай і ў гэты ж час пісаў апавяданні і сцэнарыі для кароткаметражнага кіно.

За сваю прафесійную дзейнасць Аляксей Дудараў паспеў папрацаваць сябрам сцэнарна-рэдакцыйнай калегіі Беларускага тэлебачання, галоўным рэдактарам часопіса «Мастацтва», кіраўніком Тэатра беларускай арміі. Сёння драматург з'яўляецца старшынёй Беларускага саюза тэатральных дзеячаў.

Спадар Аляксей — аўтар п'ес «Вечар», «Вежа», «Адцуранне», «Палачанка», «Чорная панна Нясвіжа», лібрэта да пастаўленага ў Вялікім тэатры балета «Вітаўт», сцэнарыя (у суаўтарстве) знятай у 2014 годзе карціны «Белыя росы. Вяртанне».

На сцэне

Елізар'еў, Камю і Хідлстан

Пяць спектакляў, якія можна паглядзець анлайн на будучым тыдні

Распаўсюджванне каранавіруса па-ранейшаму ўносіць карэктывы ў наша культурнае жыццё, і мы працягваем «хадзіць» у тэатры выключна анлайн. Часовая нязручнасць апынулася паўнавартасным эрзац-фарматам у тэатральнай культуры, які хоць і не замяняе спектаклі ў афлайне, тым не менш мае свае перавагі. Цяпер у большасці выпадкаў глядач не прывязаны да пачатку спектакля, а можа ўключыць запіс у любы зручны для сябе момант; ён ужо не мусіць выбіраць сукенку альбо гальштук, каб з'явіцца ў зале ў прыдатным выглядзе, а больш за тое — можа рабіць на балеце неналежныя рэчы накшталт паядання вячэры; нарэшце, ён мае ледзь не бясконцы выбар, глядзець оперу, сучасныя тэатральныя формы альбо цыркавое відовішча. У чарговай падборцы, якая прыйдзецца дарэчы на наступным тыдні, мы сабралі Шэкспіра, Камю і шмат танцаў.

«Ода» Джамара Робертса ў тэатры Алвіна Эйлі.

«Карміна Бурана» Вялікага тэатра оперы і балета

Наш Вялікі добра прадстаўлены ў «Белтэлерадыёфондзе», які на сваіх афіцыйных старонках у сацсетках Facebook і «УКантакце» перыядычна публікуе захаваныя пастаноўкі. 5 чэрвеня «залаты» фонд выклаў запіс, зроблены яшчэ ў 1986 годзе, — гэта ўнікальны балетны спектакль «Карміна Бурана» Карла Орфа, увасоблены вядомым харэографам Валянцінам Елізар'евым, які сёння з'яўляецца мастацкім кіраўніком Вялікага. Вакальна-харэаграфічная пастаноўка асноўваецца на кантаце нямецкага кампазітара, а кантата ў сваю чаргу створана па матывах аднайменнага зборніка вершаў сярэдневяковых вандроўных паэтаў. Звычайна «Карміна Бурана» ўвасаблялася ў канцэртных пастаноўках, а на сцэне тэатра ў Мінску Валянцін Елізар'еў аб'яднаў артыстаў балета, салістаў оперы, хор і аркестр і з кантаты Орфа зрабіў тэатральны спектакль. Запіс шукайце ў суполках #ЗОЛОТОЙФОНДБТ.

«Калігула» ў Тэатры нацый у Маскве

Вядомы рэжысёр, вядомы тэатр і вядомыя акцёры. Сённяшні Тэатр нацый, між іншым, месціцца ў будынку, які некалі для свайго прыватнага тэатра пабудаваў Фёдар Корш — дзед класіка беларускага кінематографа Уладзіміра Корш-Сабліна. Вядомы літоўскі і савецкі рэжысёр Эймунтас Някрошус паставіў тут экзістэнцыяльную драму «Калігула» паводле п'есы Альбера Камю, у якой ёсць імператар, што есць дзяцей, і прыгнечаны народ, але спачуванне тым не менш выклікае менавіта правіцель. Галоўную ролю ў спектаклі іграе Яўген Міронаў. Пастаноўка з 24 мая на тры месяцы даступная ў анлайн-кінатэатры Okko.

«Карыялан» у Нацыянальным тэатры ў Лондане

Лонданскі Нацыянальны тэатр у час каранавіруса забяспечвае гледачоў адной з самых шыкоўных і спакушальных анлайн-праграм, таму да яе немагчыма не вяртацца. Да 11 чэрвеня на YouTube-канале тэатра можна паглядзець шэкспіраўскую трагедыю «Карыялан» з Томам Хідлстанам у галоўнай ролі. Пастаноўка расказвае пра апісанага яшчэ Плутархам рымскага палкаводца і правадыра Карыялана, яго ваенныя перамогі і барацьбу з ворагамі, палітыку і помсту ў Старажытным Рыме. Тома Хідлстана, што іграе Карыялана, гледачы ведаюць па кінаролях, у прыватнасці ў фільмах «Поўнач у Парыжы» Вудзі Алена, «Выжывуць толькі палюбоўнікі» Джыма Джармуша альбо марвелаўскай серыі пра супергерояў «Мсціўцы». Запіс суправаджаецца англійскімі субцітрамі, а на сайце тэатра можна знайсці суправаджальныя ролікі і інтэрв'ю з тымі, хто робіць пастаноўку.

Серыя твораў Алвін Эйлі Амерыканскага тэатра танца

У 1958 годзе харэограф Алвін Эйлі стварыў Амерыканскі тэатр танца свайго імя — за час існавання танцавальная кампанія ў Нью-Ёрку зрабіла вялікі ўнёсак у развіцце сучаснага танца як такога і з'яўленне ў танцавальным тэатры чорных выканаўцаў. У сваёй працы Алвін Эйлі стала звяртаўся да афрыканскай культуры, чым надзейна замацаваў яе на сцэне. У час каранавіруса каманда тэатра лічыць, што «шоу павінна працягвацца», таму публікуе свае работы для прагляду анлайн. Сярод іх — пастаноўкі розных харэографаў і ў тым ліку стваральніка кампаніі. Надзвычайныя танцавальныя кампазіцыі можна знайсці на сайце тэатра Алвіна Эйлі — тут пастаноўкі «Ода» Джамара Робертса (да 10 чэрвеня), «Хрома» Уэйна МакГрэгара альбо «Адкрыцці» Алвіна Эйлі (да 11 чэрвеня).

«Масакра» ў Новым тэатры ў Варшаве

Яшчэ адна танцавальная пастаноўка — гэтым разам з варшаўскага Новага тэатра. І сапраўды новага: калектыў быў створаны ў 2008 годзе і паказаў свой першы спектакль у 2009-м. Сёння ў будынку тэатра можна ўбачыць асучасненую класіку, эксперыментальныя пастаноўкі, калі эксперымент разумець шырока, танцавальныя спектаклі і іншае. «Масакра» створана танцорам і харэографам Паўлам Саковічам і мовай танца расказвае пра экспедыцыю 1937 года, накіраваную польскім урадам на Мадагаскар, каб даследаваць магчымасць каланізацыі вострава. Як мы ведаем, Мадагаскар польскай калоніяй так і не стаў. Прэм'ера запісу пастаноўкі адбудзецца 7 чэрвеня і будзе даступная цягам 36 гадзін, гэта значыць, глядзець яе варта, калі не ў нядзелю, то ў панядзелак на сайце Новага тэатра.

Вольга МІЦКЕВІЧ.